

*Мінскі фальклорны гурт «Гуда».*

**МІ́НСКІ ФАЛЬКЛО́РНЫ ГУРТ «ГУ́ДА»** («Guda»). Заснаваны ў 1994 пры навуковым цэнтры «Крыўя», з 1999 працуе пры кафедры тэорыі і гісторыі культуры Бел. педагагічнага універсітэта імя М.Танка. Кіраўнікі: В.Емяльянчык (з 1994), В.Міхно (з 1999). Асноўны кірунак творчасці — вывучэнне і пераманне спеўных традыцый усіх этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі, узнаўленне старажытных абрадаў і свят. У рэпертуары каляндарна- і сямейна-абрадавыя песні: «Клік, вясна!», «Як на нашай вуліцы да й на перавулку», «Па бару хаджу», «Пара, жнейкі, дамоў ісці», «Ой, у ляску, ляску, на жоўтым пяску» і інш. Выканальніцкай манеры ўласціва дакладная перадача аўтэнтычнага гукавядзення пры выкананні абрадавых песень: напружанасць тэмбраў, унісонна-гетэрафонная форма спеву. Калектыў — удзельнік міжнародных фестываляў «Балтыка-96» (Вільнюс), «Навагрудак-2002», «Старажытны Нясвіж» (2003), «Około folku» (в. Пархова, Польшча, 2004), «Адлюстраванне» (г. Варэна, Літва, 2004), Рэспубліканскага фестывалю сучаснага фальклору «Таўкачыкі» (Мінск, 2004) і інш. Запісаў кампакт-дыскі «Guda. Архаічныя абрадавыя спевы» (2002), «Ігры багоў» (2005; аднайменная сольная праграма, 2004).

*Літ.*: Сіўрава Л. Кашубская гісторыя гурта «Guda» // Культура. 2004. 27 лістап. — 3 снеж.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ